вытягивать у своего соперника любую карточку и проверять, знает ли он, как правильно пишется это слово. За правильный ответ начисляются очки.

Результат изменений, наблюдаемых при использовании приемов НЛП в ходе преподавания русского языка, проявляется в нескольких направлениях. В первую очередь, это повышение интереса к русскому языку как учебной дисциплине, благоприятный климат во время урока, ценностная ориентация учащихся на успех. Это проявляется в активной позиции учащихся к мероприятиям, посвященным русскому языку. Повышается интерес к урокам, к примеру, к изучению орфографических правил. Показателем успешности может служить интерес и желание ребят участвовать в различных конкурсах, викторинах, связанных с орфографией.

Наблюдается включенность в работу всех ребят, повышение грамотности у учащихся, в том числе ребят с низкими и средними способностями. С другой стороны, качественный показатель этих изменений замечен в умении применять полученные на уроках русского языка знания в других жизненных ситуациях.

**Сянкевіч В.І.**
*(Брэст, УА «БрДУ імя А.С. Пушкіна»)*

## ІНСТЫТУЦЫЯНАЛЬНАЯ РЭАЛЬНАСЦЬ І КАТЭГОРЫЯ ПАФАСУ

Рытарычная сутнасць пафасу вынікае з яго дыскурсіўнасці і рэзанантнасці, эмацыянальна-ідэалагічнай накіраванасці, сувязі з формамі грамадскай свядомасці і інстытуцыянальнай рэальнасцю, якая мае суб’ектыўнае маральна-прававое вымярэнне. Названымі рытарычнымі прыметамі інстытуцыянальны пафас адрозніваецца ад стыхіі жывога слова – этычнага кагнітыўнага канцэпту, прырода якога паэтычная. Галоўнай апорай у трансляцыі і станаўленні пафасу маўлення выступаюць іменныя катэгорыі – перш за ўсё, уласныя імёны і асабовыя займеннікі, што тлумачыцца іх суб’ектыўным і ідэйна-прававым патэнцыялам.

Разуменне мовы не толькі як сродку зносін как, але і як культурнай інстытуцыі і ідэалагічнага інстытуту адкрывае перад лінгвістыкай перспектыву вывучэння традыцыйных для моваазнаўства з’яў з пункту гледжання інстытуцыянальнай тэорыі, у якой акцэнт ставіцца на канструяванне сацыяльнай рэальнасці мовай. Галоўную ролю ў такой рэальнасці іграе інстытут імені. З дапамогай мовы чалавек не толькі пасіўна ўпісваецца ў эмпірычную рэальнасць, але і дзейсна пазіцыяніруе сябе ў новай рэальнасці як свядомы член грамадства. Сцвярджэнне ўласнай суб’ектыўнасці і станаўленне асобы не абыходзіцца без фундаментальнага складальніка дыскурсу – пафасу.

Праблема ідэнтыфікацыі ў сучасным свеце паднімаецца на ключавы ўзровень: „zaledwie parę dziesięciolеci temu problem tożsamości bynajmniej nie absorbował naszych codziennych myśli, pozostając jedynie obiektem filozoficznych rozważań. Dzisiaj jednak tożsamość to najgłośniejsza sprawa, o której się trąbi na każdym rogu, gorący temat, który wszyscy mają na ustach" [4, с. 18–19].

Падставай ідэнтыфікацыі асобы выступае катэгорыя тоеснасці. Тоеснасць цалкам належыць анталогіі: *No entity without identity* 'Няма сутнасці па-за катэгорыяй тоеснасці.' [5] Тоеснасць – катэгорыя субстанцыі, а не формы. Чалавек застаецца самім сабой, нягледзячы на тое, што ў розныя перыяды свайго зямнога вандравання яго аблічча мяняецца да непазнавальнасці.

Тоеснасць устанаўліваецца ў адносінах да адзінкавых суб'ектаў і класа –калектыўнага суб'екта. Суб'ект сацыяльных зносін ідэнтыфікуе сябе не толькі як тоесную сабе асобу, але і як члена пэўнага сацыяльнага калектыву. Апорай асабістай і сацыяльная ідэнтыфікацыя выступае катэгорыя пазіцыяніравання. Слова *пазіцыяніраванне* ў існуючых тлумачальных слоўніках рускай і беларускай моў не зафіксавана. Аднак яно актыўна ўжываецца ў сучасных дыскурсах. У сацыяльным жыцці аказваецца істотным тое, як пэўны суб'ект пазіцыяніруе сябе адносна другіх. Без уласнай пазіцыі суб'ект прававых зносін не існуе як аўтаномная адзінка. Катэгорыя пазіцыяніравання іграе вызначальную ролю ў маркетынгавай дзейнасці, калі пэўны юрыдычны суб'ект (напр., кампанія) выбірае такую рыначную пазіцыю для сябе, якая будзе выгадна адрозніваць яго ад становішча канкурэнтаў.

Слова *пазіцыя* набывае адметнае сацыяльна-палітычнае гучанне (*міжнародная пазіцыя дзяржавы*). Атрыбутам гэтага слова звычайна выступае азначэнне *актыўная* (*актыўная жыццёвая пазіцыя*). Пазіцыя для суб'екта – заўсёды "сваё" месца. Гэтае месца можа быць акрэслена: а) як лепшае: *Не, нашаму чалавеку лепшага месца няма, як дома, на сваёй роднай зямлі* (Якімовіч); б) як адпаведнае, напр.: *Ведаць (знаць) сваё месца* – паводзіць сябе адпаведна свайму становішчу, не ўмешвацца не ў свае справы; быць сціплым; в) як вакантнае (нулявое) месца (*Пустое месца* – пра чалавека, ад якога няма ніякай карысці або з якім ніхто не лічыцца): *Сядзіць вось за сталом часамі значны чын. Спрабуй, скажы яму, што ён – пустое месца* (Корбан); г) як значнае ў сістэме , напр.: *На (сваім) месцы* – адпавядае свайму прызначэнню (ТСБМ). "Сваё" месца звязана з адносінамі парадку: *Стаць на сваё месца* – прыйсці ў парадак. Прыкметай парадку з'яўляецца становішча, калі кожны член знаходзіцца на сваім (адпаведным яму) месцы: *Апартуніст. Форменны апартуніст, – з той жа яснасцю, перакананасцю даў азначэнне /Башлыкоў/ Апейку. – Яўна кульгае*

*на правую. І відаць ужо – безнадзейна... З такім далёка не пойдзеш у адной упражцы. – Натуральна вынікала далейшае, практычнае: – Не на месцы. Яўна не на месцы* (І. Мележ. Завеі, снежань).

Дыскурсіўнае выражэнне асабістай тоеснасці ажыццяўляецца уласнымі займеннікамі. Самым лаканічным перфарматыўным актам маўлення з'яўляецца акт непасрэднага вымаўлення асобай "Я". Гэтым актам канструіруецца ўласная тоеснасць – ажыццяўляецца аўтакрэацыя. "Той ёсць "ego", – адзначае Э. Бенвеніст, – хто вымаўляе ego". Мы знаходзім тут самую аснову суб'ектыўнасці, якая вызначаецца моўным статусам асобы" [1, 268]. Ідэалістычная філасофія, а за ёй і руская граматыка 40-50 гадоў, бачыла ў акце самасвядомасці "я" і ўзнікненні займенніка першай асобы зараджэнне самой катэгорыі імені. "*Я, ты, ён*, бясспрэчна, адносяцца да імені. У граматыках жа нашых гэтыя словы называюць займеннікамі. Хаця вельмі дзіўна ўявіць "я", "ты" займеннікамі – замест якога імені ўжываюцца яны? – аднак само слова займеннік указвае на разрад імені. [2, 267]

Вымаўленне "Я" выступае адначасова ажыццяўленнем маўленчага акта ўласнага пазіцыяніравання. "Я" называе таго, хто гаворыць, і адначасова падразумявае выказванне пра "я": вымаўляючы "я", нельга не гаварыць пра сябе. Той, хто вымаўляе "я", пазіцыяніруе сябе ў якасці ўнікальнай асобы; асабістая ўнікальнасць супярэчыць магчымасці плюралізацыі "Я". Ключавымі пытаннямі ў працэсе канструіравання ўласнай асобы з'яўляюцца пытанні *"Хто я?", "Хто другія?" , "За каго прымаюць мяне партнёры па маўленчай інтэракцыі?"*

Homo institutius (чалавек інстытуцыянальны) – асоба, якая маніфестуе сябе праз "Я". "У "Я" ўвасоблены пафасны патэнцыял, здольны пры неабходнасці рэалізавацца ў дыскурсіўным маўленні. "Praktyki pozycjonowania można więc rozpatrywać również jako pewnego rodzaju akty symbolicznej „przemocy", które dokonywane są za pomocą języka;" [ 6, 131] напр.: *Слово «я» было самым употребляемым в интервью. Я построил, я дал, я предоставил, я принес... Оно вылетало буквально с каждого сантиметра пленки. Оно важно надувалось, громко кричало, от него исходила громадная тень, в которой копошились все остальные. Все вертелись исключительно вокруг оси этого самого Я* (Народная воля, 20.06.2005).

У практыцы моўнага пазіцыяніравання галоўную ролю іграе катэгорыя імені. Займеннік першай асобы "я" непазбежна суадносіцца з уласным іменем і акрэсленасцю сваёй грамадзянскай пазіцыі ў імені агульным: *– Я, Васіль Шырко, грамадзянін маёй рэспублікі, літаратар і журналіст, буду актыўна ўдзельнічаць у выбарах* (З газет.). Уласнае імя з'яўляецца першым і найбольш істотным самапраяўленнем чалавечага "я".

Уласнае імя, якое стаіць за “я”, падымае чалавека на ўзровень грамадскага жыцця: “Да імені чалавек не ёсць яшчэ чалавек, ні для сябе, ні для другіх; не ёсць суб’ект асабовых адносін, значыць, не ёсць член грамадства, а толькі магчымасць чалавека, абяцанне такога, зародак.” [3, 62] Чалавечае “я” , змяняючыся пад уплывам сацыяльных умоў, разам з ростам ведаў, культуры паняццяў і выхаваннем волі, тым не менш захоўвае ўнутраную цэльнасць і адноснае пастаянства. Дзякуючы наяўнасці некаторых істотных характарыстык структуры духоўнага свету, чалавек застаецца самім сабой.

Уласнае імя супрацьпастаўляецца этычным назвам-дэскрыптывам: *Як тваё імя, якога роду ты? Хто наканаваў табе твой шлях? Таямніц якіх словаў непрастых Адшукаць хацеў у гэтых краях?* (С. Осіпаў, А. Усціновіч). Пытанне *“Якога роду ты?”* прадугледжвае этычную назву. Сутнасць назвы дэскрыптыўная. Рэферэнтам назвы выступае аб’ект (індывід). Назва-дэскрыптыў – гэта метка. Меціцца тое, што актуальна (“тут і зараз”) кідаецца ў вочы. Канкрэтная лексіка, якая называе рэаліі, уся дэскрыптыўная.

Дэнатат імені – суб’ект, які пазіцыяніруе сябе ў ідэалагічным прававым полі. Імя – катэгорыя юрыдычная. Так, Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь гарантуе нам: «право на жизнь, достойные условия жизни и охрану здоровья, образование и труд, отдых и досуг, на свободу личности и защиту, на имя и гражданство, материальное обеспечение (Арт.43).

Імя ідэнтыфікуе суб’екта права не толькі як тоесную сабе асобу, за якой стаіць «Я» (*Я, Іван Пятровіч)*, але і як асобу, якая атаясамлівае сябе з сацыяльна легітымным калектывам (*доктар, настаўнік, журналіст* і да т.п.). Сацыяльнае атаясамліванне выражаецца камітатыўным займеннікам «Мы»: – *Ну, от і ідзі ў еты свой рай! А мы, нібыто, так пажывем! Нам і так непагана!* (Іван Мележ, Людзі на балоце).

Асоба павінна па праву насіць пэўнае імя. Права на імя – філасофская праблема: – *Паслухай, ты, – шэпт Хрысці перарывісты. – У майго сына ёсць імя, прозвішча і імя па бацьку. Ён – Хведар Хведаравіч Жытнік. Разумееш? Мой муж, Хведар Жытнік, які загінуў на фронце, наказаў даць гэтаму дзіцяці сваё прозвішча і імя... І я нікому! Разумееш? Нікому! Нават табе не дазволю*! (Клаўдзя Каліна, Маці і сын).

На ўзроўні мовы практыка пазіцыяніравання рэалізуецца як прыпісванне сабе і партнёрам інтэракцыі розных індывідуальных і сацыяльных атрыбутаў або як пацвярджэнне ці адмаўленне іх. Моўныя сродкі, з дапамогай якіх ажыццяўляецца пазіцыяніраванне, не з’яўляюцца спецыфічнымі. Кожны акт пазіцыяніравання можна з дапамогай мовы рэалізаваць рознымі спосабамі. Аднак усе яны становяцца своеасаблівым

спосабам ідэнтыфікацыі сябе і іншых у сацыяльнай прасторы і заняцця ў ёй акрэсленага месца (пазіцыі). Дыскурсам пазіцыяніравання канструіруецца сацыяльная рэальнасць.

Палымяныя (пафасныя) прамовы не запатрабаваны на ўзроўні слоўнага этасу. У адрозненне ад імені, якое "вешае ярлыкі" на дадзеныя вопыту, слова прадракае і прарочыць, але не наракае. Нараканне ў этычным кантэксце звязана з асуджэннем і абвінавачаннем. Аднак на ўзроўні свядомага быцця нараканне – маўленчы акт, які канструіруе інстытуцыянальную рэальнасць. Эвалюцыйны этас і ціхі роздум мудрага слова змяняецца рэвалюцыйным пафасам з яго канструктыўнай ідэалогіяй. Біблейскі выраз и сотворимъ себѣ имя трактуецца як супраціўны пакоры акт узнясення сябе над светам. Создати себѣ имя – значыць узаконіць сябе як суб'екта права – узвесці ў закон, стаць дачыненым да абсалютнага быцця, якое ўласціва толькі Богу. Нараканне – рэвалюцыйны акт свабоды і станаўлення чалавека як асобы. Гэты акт звязаны з інстытуцыяналізацыяй сацыяльнай рэальнасці. Інстытуцыяналізацыя – пераход ад стыхійнай, спантаннай (неарганізаванай) дзейнасці да ўстанаўлення арганізацыйных структур, якія рэгламентуюць сацыяльную дзейнасць і арганізуюць сацыяльныя стасункі. У гэтай новай рэальнасці адбываюцца падзеі, рэалізуюцца ідэі і сацыяльныя праекты.

У прарочым слове адсутнічае катэгорыя права. Гаворка рэгламентуецца звычаем. Чэснае слова – катэгорыя не юрыдычная. Катэгорыя права ўзнікае ў сувязі з іменем і актам намініравання. Закон выступае гарантыяй годнасці члена грамадства, увасобленай у імені. Слова творыць, але не "дзее" – ім не ажыццяўляюцца акты, якія маюць юрыдычныя наступствы. Слова – благое (*блаславенне, благавешчанне*). Словам здымаюцца пытанні, аднак не вырашаюцца праблемы. Эфект слова "тэрапеўтычны". Слова лечыць, напр., у загаворы, аднак яму бракуе аператыўнай спраўнасці. Антытэза слова і імені ёсць антытэза этасу і пафасу.

Ідэалагічна-пафасная сутнасць уласнага імені актуалізуецца ў перыяды рэвалюцыйных пераўтварэнняў. Імя непазбежна ўсведамляецца ў сувязі з пэўнай ідэяй: *– Цябе як завуць, хлопчык? – спытаўся Марк. – Серафім... – Імя, скажу табе, падкачала: херувімы, серафімы!.. Зайграванне з божанькай... Ты будзеш Сеня. Гучыць па-пралетарску! Сеня!.. А што, добра!* (А.Асіпенка. Лабірынты страху); *Кінамеханік тут фігура! Самі пабачыце. А як яго імя, ніколі не здагадаецеся: Молат. Праўда, Молат Дзмітрыевіч. Самае індустрыяльнае імя ўляпілі бацькі на ўсё жыццё.* (Грахоўскі). Імкненне напоўніць уласныя імёны рэвалю-цыйным сэнсам выразна праявілася ў першыя гады савецкай улады: *Рэўмір* –

Рэвалюцыя міравая, *Марлен* – Маркс і Ленін, *Кім* – Камуністычны інтэрнацыянал моладзі і інш.

Пафас – уласцівасць дыскурсіўная. Ідэалагізацыя слова непазбежна звязана з яго дыскурсіўнай трансфармацыяй. У жыцці адбываюцца знакавыя падзеі – карэнныя грамадскія пераўтварэнні. У розныя перыяды гісторыі ў рознай ступені жыццё непазбежна падвяргаецца ідэалагізацыі, што не можа не адлюстравацца ў мове. Ідэалагізацыя слова адбываецца па меры ідэалагізацыі жыцця. У часы рэвалюцыйных пераўтварэнняў антытэза “паэт і грамадзянін” губляе выразныя контуры. Паэт займае актыўную грамадзянскую пазіцыю, становіцца трыбунам, і яго творы набываюць пафаснае гучанне. Так, заклікам да барацьбы з ворагам гучаць радкі верша Янкі Купалы “Беларускім партызанам!”: *Партызаны, партызаны, Беларускія сыны! За няволю, за кайданы Рэжце гітлерцаў паганых, Каб не ўскрэслі век яны.* Даследаванне маўленчага пафасу знаходзіцца ў рэчышчы фундаментальнай праблемы сувязі мовы і ідэалогіі.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

1. Бенвенист, Э. Общая лингвистика / Э. Бенвенист. – М.: Прогресс, 1974.
2. Виноградов, В. В. Русский язык. Грамматическое учение о слове /В. В. Виноградов. – 3-е изд. – М.: Высш. шк., 1986.
3. Флоренский, П. Имена / П. Флоренский Малое собрание сочинений. – Т. 1. – Москва: Купина, 1993.
4. Bauman, Z. Tożsamość. Rozmowy z Benedetto Vecchim / Z. Bauman. – Gdańsk: GW, 2007.
5. Castaneda, H. P. Identity and sameness / H. P Castaneda // Philosophia, vol.5, 1975, № 1–2.
6. Czyżewski, M. Dyskursy tożsamościowe w nauce i życiu społecznym: odmiany, własności, funkcje // Tożsamość, nowoczesność, stereotypy. – Kraków: NOMOS, 2012.

**Сянкевіч М.І.**
*(Брэст, УА «БрДУ імя А.С. Пушкіна»)*

## МЕТОДЫКА ПРАЦЫ З ФАЛЬКЛОРНЫМІ ТВОРАМІ «МАЛОГА ЖАНРУ» Ў ПАЧАТКОВАЙ ШКОЛЕ

Вусная народная творчасць на працягу многіх стагоддзяў была своеасаблівым падручнікам жыцця, з дапамогай якога перадаваліся ад старэйшага пакалення да малодшага вопыт і веды, жыццёвая этыка і філасофія. Нікольки не паменшала яе роля і ў пару кампьютарных тэхналогій. Таму заканамерна, што складальнікі буквароў, чытанак, іншых